

Падчас размеркавання ў БДУКМ

# Пяць заявак на аднаго

## Што такое размеркаванне ў БДУКМ?

**Менавіта ў красавіку адбываецца размеркаванне студэнтаў па будучых месцах працы, у тым ліку і ў творчых ВНУ краіны. І хоць працэдура гэта ўжо традыцыйная, але за кожным росчыркам пяра — чыйсьці творчы і жыццёвы лёс, які, разам з іншымі, паўплывае і на развіццё сферы культуры ўсёй краіны. "К" пабывала на адным падобным размеркаванні ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, каб на свае вочы ўбачыць, як працадаўцы "змагаюцца" за выпускнікоў.**

### ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ У ЛІЧБАХ

27 красавіка ў БДУКМ адбылася размеркаванне студэнтаў і магістрантаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый. Камісію па размеркаванні ўзначаліла рэктар установы Наталля Карчэўская, якая ў сваім звароце павітала працадаўцаў, замоўцаў кадраў, выпускнікоў і ўсіх прысутных з пачаткам працы камісіі. У сваю чаргу, дэкан факультэта Юлія Галкоўская адзначыла, што сёлета выпускаюцца 36 студэнтаў па спецыяльнасці "бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць", 12 — па спецыяльнасці "музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны", а таксама 4 магістранты.

Заўважу, што яшчэ па дадзеных папярэдняга размеркавання, якое адбылося ва ўніверсітэце 24 сакавіка, на 36 студэнтаў, што навучаліся па спецыяльнасці "бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць", было пададзена 178 заявак ад будучых працадаўцаў (гэта амаль пяць заявак на аднаго спецыяліста!). На спецыяльнасць "музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны" на 12 чалавек было пададзена 34 заяўкі (амаль тры заяўкі на аднаго выпускніка). І змаганне за гэтых спецыялістаў ішло, што называецца, не на жарты. Працадаўцы запрашалі тых студэнтаў, хто яшчэ не вызначыўся з выбарам, да сябе, абяцалі грашовую падтрымку, жыллё і іншыя "выгады". А члены камісіі на чале з Наталляй Карчэўскай дэталёва ўнікалі ва ўсе нюансы кожнай канкрэтнай сітуацыі, асабліва акцэнтуючы ўвагу на пытаннях, звязаных з жыллём для будучых маладых спецыялістаў.

### ДЫРЭКТАРАМ? КАЛІ ЛАСКА!

Варта адзначыць, што першыя працоўныя месцы ў выпускнікоў — гэта музеі і бібліятэкі як рэгіянальнага, так і рэспубліканскага ўзроўню. Прычым многія студэнты размеркаваліся туды, дзе падчас вучобы праходзілі практыку.

— Падчас навучання ва ўніверсітэце я праходзіла практыку ў Міністэрстве культуры Беларусі, у Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, у Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы, — кажа пакуль яшчэ магістрантка, а ў самым бліжэйшым часе малады спецыяліст Марыя. — І ўсё ж такі вырашыла звязаць свой лёс менавіта з апошняй названай музейнай установай. Мне вельмі падабаецца даведвацца і расказваць пра жыццё і творчасць Янкі Купалы, таму мяркую, што працаваць у музеі мне будзе вельмі цікава і камфортна.

> У сённяшняга выпускніка сапраўды ёсць час, каб цвяроза ўзважыць усе "за" і "супраць" і зрабіць свой выбар на карысць таго месца працы, якое яго больш за ўсё задавальняе. Гэты асабісты выбар робіцца абсалютна свядома, а таму — больш разважліва і асэнсавана, з разлікам на трываласць і, галоўнае, на перспектывы.

Яшчэ адна студэнтка размеркавалася ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

— Яшчэ падчас вучобы на трэцім курсе ўніверсітэта мне прапанавалі папрацаваць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі на палову стаўкі, — кажа студэнтка Сабрына. — Мне там вельмі спадабалася, і таму я цяпер іду працаваць туды, дзе ўсё мне вядома і дзе ўсе мяне добра ведаюць.

Былі на размеркаванні і досыць цікавыя выпадкі, калі студэнт адразу пасля атрымання дыплома ехаў працаваць... дырэктарам музея!

— Падчас практыкі я ездзіла ў Свіслач, у мясцовы гісторыка-краязнаўчы музей, дзе пазнаёмілася з калектывам, і мне там спадабалася, — кажа студэнтка Паліна, якая літаральна праз некалькі месяцаў зойме пасаду дырэктара названай установы. — Думаю, мне там будзе цікава, тым больш я вельмі хацела паехаць працаваць менавіта ў Гродзенскую вобласць, хоць родам я з Магілёўшчыны. Зразумела, гэтая пасада — вялікая адказнасць, але мае бацькі ды нават дзядуля і бабуля, якія самі працавалі і працуюць на кіраўнічых пасадах, навучылі мяне не баяцца адказнасці, і таму, спадзяюся, з працай і высокай пасадай я спраўлюся паспяхова.

Адметна, што, як заўважыў загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны, кандыдат культуралогіі Дзмітрый Герасімёнак, цяпер на пасадзе дырэктара ў Свіслацкім гісторыка-краязнаўчым музеі працуе Максім Лукша — таксама выпускнік БДУКМ. Так што, як бачна, узровень падрыхтоўкі спецыялістаў, якія выходзяць са сцен універсітэта, сапраўды вельмі высокі. Зразумела, пра гэты высокі ўзровень падрыхтоўкі ў раёнах Беларусі даўно ведаюць і таму без асаблівых пытанняў даюць згоду на прызначэнне ўчарашніх студэнтаў кіраўнікамі той ці іншай установы.

### ПРЫЙДЗІ ДА НАС, СПЕЦЫЯЛІСТ!

Натуральна, Мінск, як і заўсёды, забірае сабе большую частку выпускнікоў. Напрыклад, побач са мной на размеркаванні сядзела намеснік дырэктара Дзяржынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы Вольга Канстанчук, якая не першы раз прыязджае ў БДУКМ, каб адшукаць маладога спецыяліста для сваёй установы. Але шанцуе ёй не так часта, як хацелася.

— Куды ж нам угнацца за Нацыянальнай бібліятэкай ці іншымі сталічнымі ўстановамі? — спытала мяне Вольга Канстанчук. — Таму, не сакрэт, пераважную большасць выпускнікоў забіраюць менавіта буйныя бібліятэкі краіны. Але ўсё адно ездзім, і ездзім не першы год, бо, як кажуць, надзея памірае апошняй. Некалькі гадоў таму атрымалі двух спецыялістаў, бо яны хацелі размеркавацца менавіта да нас. Але гэтага, канешне, не хапае. Між тым, як я лічу, менавіта ў нас выпускнікам можна рэалізавацца напоўніцу, з жыллём мы стараемся дапамагаць кожнаму, ды і той жа Мінск ад нас не так далёка.

А вось кіраўнікі сталічных устаноў культуры не хавалі сваёй радасці ад таго, што да іх сёлета прыйдуць маладыя спецыялісты.

— Каб магла, дык забрала б да сябе ўсіх выпускнікоў! — кажа загадчыца культурна-адукацыйнага аддзела Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Кацярына Катлоўская. — Мы даўно ведаем, што выпускнікі БДУКМ — высакакласныя спецыялісты, гэта ўжо сапраўды менавіта спецыялісты, а не студэнты, якія валодаюць усімі неабходнымі якасцямі для працы ў музеях. Таму хачу падзякаваць усім выкладчыкам, рэктару БДУКМ за працу і за такіх выпускнікоў. Яшчэ падчас вучобы яны праходзяць у нас практыку, прычым у розных аддзелах, прыглядаюцца да таго, што менавіта іх цікавіць. І таму ідуць да нас ужо мэтанакіравана і з веданнем усіх нюансаў будучага працоўнага месца.

Радаваліся ў гэты дзень не толькі ў музеях, але і ў бібліятэках. Так, з 36 выпускнікоў спецыяльнасці "бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць" чацвёра пайшлі працаваць у Цэнтралізаваную сістэму дзіцячых бібліятэк Мінска.

— Наша ўстанова з'яўляецца базай для практыкі студэнтаў факультэта, таму мы ўсіх маладых спецыялістаў добра ведаем і вельмі іх чакаем, — кажа Таццяна Швед. — Імі як спецыялістамі мы вельмі задаволеныя, бо яны без праблем уліваюцца ў наш калектыў, ведаюць усе нюансы бібліятэчнай прафесіі, працаваць у нас ім даволі лёгка. Да таго ж у кожнай нашай бібліятэцы — свая спецыфіка работы, таму маладыя спецыялісты могуць абраць той кірунак працы, які ім больш за ўсё да душы.

Як бачна, у сённяшняга выпускніка сапраўды ёсць час, каб цвяроза ўзважыць усе "за" і "супраць" і зрабіць свой выбар на карысць таго месца працы, якое яго больш за ўсё задавальняе. Прычым гэты асабісты выбар робіцца абсалютна свядома, а таму — больш разважліва і асэнсавана, з разлікам на трываласць і, галоўнае, на перспектывы. У выніку на першае месца працы малады чалавек едзе не "тэрмін адбыць", а будаваць сваё далейшае жыццё.

Ды і працадаўцы робяць высновы наконт таго, чым сёння можна "спакусіць" добрых спецыялістаў, якія і без таго запатрабаваныя. Са свайго боку, камісія па размеркаванні намагаецца максімальна ўлічыць самыя неабходныя патрэбы маладых спецыялістаў, асабліва жыллёвыя. І калі казаць у цэлым, размеркаванне, на мой погляд, прайшло ў спакойных, добразычлівых умовах, без асаблівых праблем і даволі хутка.

— Размеркаванне студэнтаў мы рыхтавалі ўжо з самага пачатку навучальнага года, — кажа Юлія Галкоўская. — Правялі вялікую працу па пошуку вакансій, адпаведных высокай кваліфікацыі нашых выпускнікоў, размясцілі ўсю сабраную інфармацыю ў дэканаце, дзе кожны ахвотны мог прыйсці і выбраць сабе менавіта тое месца і тую працу, якая яму больш за ўсё даспадобы. Як вы самі пабачылі, сёлета ўдалося сумясціць пажаданні і студэнтаў, і працадаўцаў, таму ў выніку размеркаванне прайшло паспяхова. Таму гэтым размеркаваннем я як дэкан факультэта вельмі задаволеная.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ**
Фота аўтара